Падтрымай "Вясну" на PATREON

Больш за 40 працэсаў. У Беларусі працягваюцца суды над удзельнікамі акцый за незалежнасць фота дапоўнена

09.01.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Шэсце супраць інтэграцыі з Расеяй па праспекце Незалежнасці ў Мінску, 7 снежня. Фота: "Радыё Свабода"

Дзявятага студзеня ў Мінску і іншых гарадах краіны працягваюцца суды над удзельнікамі акцый у падтрымку незалежнасці, якія прайшлі 7, 8, 20 і 21 снежня мінулага года. На гэты дзень запланавана больш за 30 судоў па па артыкуле 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах).



Акцыі за незалежнасць Беларусі: афіша судоў на 8-10 студзеня

Каго яшчэ чакаюць суды за снежаньскія антыінтэграцыйныя акцыі? "Вясна" падрыхтавала расклад судоў на 8-10 студзеня.

Каго судзяць 9 студзеня?

Суд Партызанскага раёна г. Мінска

- палітык **Вячаслаў Сіўчык:** 9:00 (каб. 4171), ч.3 арт. 23.34 КаАП; Суддзя - **Наталля Дзядкова**; У пасяджэнні аб'яўлены перапынак.
- **Аляксей Марачкін**: 09:10, ч. 1 арт. 23.34 КаАП; Суддзя - **Барысёнак**. Вынік - **30 базавых велічынь (810 рублёў).**
- палітык **Ігар Барысаў**: 09:30, ч. 1 арт. 23.34 КаАП. Суддзя - **Наталля Дзядкова**; Вынік - **15 базавых велічынь (405 рублёў)**.

Суд Ленінскага раёна г. Мінска

- Працяг суда над **Наталляй Ладуцькай:** 10:00, ч. 1 арт. 23.34 КаАП, суддзя **Юлія Шут;** Вынік - **25 базавых велічынь (675 рублёў).**
- Працяг суда над **Барысам Дуброўскім:** 10:00 (каб. 33), ч.1 арт. 23.34 КаАП, суддзя **Аляксей Кісляк;** Вынік - **20 базавых велічынь (540 рублёў).**
- Працяг суда над **Андрэем Кудзікам:** 10.00, ч. 1 арт. 23.34 КаАП, суддзя **Т. Шоцік.** Справа вернута на дапрацоўку.

- Працяг суда над **Барысам Анікеевым:** 12:00 (каб. 3134), ч.1 арт. 23.34 КаАП; суддзя **Аляксей Кісляк;** Вынік - **30 базавых велічынь (810 рублёў).**
- **Уладзімір Някляеў:** 12:00, ч. 1 арт. 23.34 КаАП, суддзя **Т. Шоцік.** Судзяць за ўдзел у акцыі 7 снежня. Вынік - **30 базавых велічынь (810 рублёў).**
- Працяг суда над актывісткай **Ганнай Шапуцькай:** суддзя **Юлія Шут;** Вынік - **25 базавых велічынь (675 рублёў).**
- Працяг суда над **Віктарам Кавальковым (айцом Вікенціем):** 14:15, арт. 23.34 КаАП, суддзя **Аляксей Кісляк;** Судзяць Кавалькова за ўдзел у акцыі 8 снежня. Святар заявіў адвод суддзі, бо той не адказаў на яго пытанне наконт таго, ці ахрышчаны ён. Адвод адхілілі, працэс працягнуўся. Спачатку апыталі Віктара Кавалькова.

> Суддзя Кісляк: *вядома Вам было, што мітынг несанкцыянаваны?*
> Кавалькоў: *Я з'яўляюся святаром і прыходу прапаведаваць там, дзе ёсць людзі.*
> Суддзя: *Вы выкрыквалі лозунгі?*
> Кавалькоў: *Ну так, "Жыве Беларусь!" - што тут кепскага? У гімне ж напісана "Вечна жыві і квітней Беларусь".*

Затым апыталі сведку-амапаўца **Уладзіміра Шайко.** Ён пацвердзіў, што ў Кавалькова быў гукаўзмацняльнік і што той выкрыкваў лозунгі. Вынік - **50 базавых велічынь (1350 рублёў)**.

Суд Фрунзенскага раёна г. Мінска

- **Анатоль Лябедзька:** 10:00 (каб. 140), ч.1 арт. 23.34 КаАП; Вынік - **30 базавых велічынь (810 рублёў)**.
- **Андрэй Шыпулін:** 10:00,ч. 1 арт. 23.34 КаАП.
- блогер **Мікалай Маслоўскі:** 10:00 (каб. 138), ч.1 арт. 23.34 КаАП; Разгляд справы працягнецца **15 студзеня ў 14.10.**
- журналіст і актывіст **Мікалай Дзядок**: 10:00, ч. 3 арт. 23.34 КаАП.

Суд Цэнтральнага раёна г. Мінска

- Працяг суда над **Максімам Урбановічам**: 9:15, арт. 23.34 КаАП, суддзя **Валерый Есьман.** Актывіст да 11 студзеня адбывае пакаранне (15 сутак арышту) за акцыю пратэсту супраць інтэграцыі з Расіяй 7 снежня; **Вынік - 50 базавых велічынь (1350 рублёў)**.
- Працяг суда над **Максімам Урбановічам**: 9:30, арт. 23.34 КаАП, суддзя **Таццяна Акавітая;** Вынік - **50 базавых велічынь (1350 рублёў).**



Ці законна судзіць тых, хто цяпер "на сутках" у ЦІПе?

Ці законна разглядаць справы ў адсутнасці тых, хто зараз адбывае адміністрацыйныя арышты ў ЦІП? Адказвае юрыст Праваабарончага цэнтра "Вясна" Павел Сапелка.

- Працяг суда над **Андрэем Хранковым**: 9:15, ч. 3 арт. 23.34 КаАП, суддзя **Таццяна Акавітая;** Вынік - **50 базавых велічынь (1350 рублёў).**
- Працяг суда над **Андрэем Хранковым:** 9.45, арт. 23.34 КаАП,суддзя **Валерый Есьман;** Вынік - **50 базавых велічынь (1350 рублёў).**
- Працяг суда над **Аленай Янушкоўскай:** 9:15, арт. 23.34 КаАП, суддзя **Юлія Густыр;** Вынік - **30 базавых велічынь (810 рублёў).**
- Працяг суда над **Аленай Янушкоўскай:** 9:30, арт. 23.34 КаАП, суддзя **Валеры Есьман;** Вынік - **30 базавых велічынь (810 рублёў)**.
- Працяг суда над **Мікалаем Казловым**: першая палова дня (час удакладняецца), суддзя **Іван Касцян;** Вынік - **50 базавых велічынь (1350 рублёў).**
- Працяг суданад **Андрэем Шарэндай:** 9:50, ч. 3 арт. 23.34 КаАП, суддзя **Юлія Густыр**; Вынік - **50 базавых велічынь (1350 рублёў).**
- Працяг суда над **Аляксеем Сюдаком:** 9:30, арт. 23.34 КаАП, суддзя **Юлія Густыр;** Аляксей на

пасяджэнне адсутнічаў. Вынік - **30 базавых велічынь (810 рублёў).**

- Працяг суда над **Юрыем Татурам:** суддзя **Іван Касцян;** Татур быў уведамлены пра суд праз смс, аднак на працэс не прыйшоў. Вынік - **30 базавых велічынь (810 рублёў)**.
- **Лявон Баршчэўскі:** 10.00, ч. 1 арт. 23.34 КаАП, суддзя **Таццяна Акавітая;** Баршчэўскі хадайнічаў аб вядзенні працэсу на беларускай мове. Хадайніцтва задаволена. Таксама ён абураны тым, што ў пратаколе пазначана, што ў яго сярэдняя адукацыя, а не вышэйшая, як тое ёсць на самой справе. Сведкі па справе - **Сянько і Мяжон**. У выніку справу адправілі на дапрацоўку.



Лявон Баршчэўскі ў судзе

- **Яўген Батура:** 10:00 (каб. 405), ч. 3 арт. 23.34 КаАП; Суддзя - **Юлія Густыр;** Вынік - **50 базавых велічынь (1350 рублёў).**



Яўген Батура, журналістка Дзіяна Серадзюк, актывіст Арамаіс Міракян і праваабаронцы "Вясны" Андрэй Палуда і Алесь Бяляцкі

- **Алена Талстая**: 10:30 (каб. 202), ч. 3 арт. 23.34 КаАП; Суддзя - **Іван Касцян**. Вынік - **50 базавых велічынь (1350 рублёў).**
- **Ігар Краўчанка**: 10:30, ч. 1 арт. 23.34 КаАП; Суддзя - **Валерый Есьман**. На Краўчанку складзены пратакол за ўдзел у акцыі 20 снежня. Сведка - супрацоўнік АМАП **Максім Палякоў.** Вынік - **30 базавых велічынь (810 рублёў).**
- **Павел Севярынец**: 11:30, ч. 3 арт. 23.34 КаАП; Суддзя - **Іван Касцян**. Сам Павел адбывае 15-суткавы арышт у ЦІП на вул. Акрэсціна. У сувязі з немагчымасцю яўкі суд разглядаў справу ў адсутнасць Севярынца. Севярынца судзяць за заклікі на акцыі 8 снежня да ўдзелу ў новай акцыі 20 снежня. Вынік - **50 базавых велічынь (1350 рублёў)**.
- Працяг суда над мовазнаўцам **Пятром Садоўскім:** 12:00, ч. 1 арт. 23.34 КаАП, суддзя **Юлія Густыр** (каб. 309)**;** Сведка **Кавальчук** пакуль не з'явіўся. Перапынак да 12.45. Справа адпраўлена на дапрацоўку.
- Працяг суда над мовазнаўцам **Пятром Садоўскім**: 12:15, ч. 1 арт. 23.34 КаАП, суддзя **Іван Касцян**; Вынік - **30 базавых велічынь (810 рублёў)**.



Пётр Садоўскі

Суд Кастрычніцкага раёна г. Мінска

- **Віталь Трыгубаў:** 9:15, ч. 3 арт. 23.34 КаАП, суддзя **Е. Жывіца;** Вынік - **50 б.в. (1350 рублёў).**
- **Валерый Бычкоўскі:** 09:15, ч. 3 арт. 23.34 КаАП, Суддзя - **А. Рудэнка.**
- **Віталь Трыгубаў:** 10:00, ч. 3 арт. 23.34 КаАП, суддзя **О. Няборская;** Вынік - **25 б.в. (675 рублёў)**
- **Ян Грыб:** адзін працэс пачаўся ў 09.05 (суддзя **Лаўрыновіч),** другі - у 10:00, ч. 1 арт. 23.34 КаАП. Абодва працэсы перанесены з сувязі са станам здароўя Яна Грыба на 15 студзеня.
- **Мікалай Казлоў**: 10:00, ч. 3 арт. 23.34 КаАП; суддзя - **Алена Жывіца**. Вынік - **50 б.в. (1350 рублёў).**
- **Валерый Бычкоўскі**: 10:00, суддзя - **Лаўрыновіч, ч. 3 арт. 23.34 КаАП.** Вынік - **50 б.в. (1350 рублёў).**
- **Салаўёў.** ч. 1 арт. 23.34 КаАП. Суддзя - **Няборская**. Вынік - **20 б.в. (540 рублёў)**.
- **Сяргей Спарыш**: 10:45, ч. 3 арт. 23.34 КаАП, суддзя - **А. Рудэнка**.Вынік - **50 б.в. (1350 рублёў).**
- **Галіна Жукоўская**: 11:30, ч. 1 арт. 23.34 КаАП, суддзя - **А. Рудэнка.** Вынік - **20 б.в. (540 рублёў).**

Суд Пінскага раёна і г. Пінска

Адбудуцца суды за ўдзел у мясцовай акцыі супраць інтэграцыі з Расіяй, якая адбылася ўвечары 20 снежня ў цэнтры горада.

- **Зміцер Тарасюк.** Вынік - **10 базавых велічынь (270 рублёў).**
- Таццяна Кебікава**:** 11:00, арт. 23.34 КаАП; Вынік - **5 базавых велічынь (135 рублёў)**. Суддзя - **Аляксандр Пацко**.
- **Людзміла Алёхіна**: ч. 1 арт. 23.34 КаАП. Суддзя - **Аляксандр Пацко**. Вынік - **4 базавыя велічыні (108 рублёў)**.

Суд Першамайскага раёна г. Віцебска

- актывістка **Таццяна Севярынец**: 9:10, Суддзя **М. Юркевіч** Першамайскага суда Віцебска асудзіла па двух пратаколах па ч.1 арт. 23.34 КаАП. Вынік - два штрафы па 30 базавых велічынь, то бок **60 б.в. (1620 рублёў**).

Твитнуть





Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"



2023







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

EENEMO





















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY